W 359/60

ПЧАЛА

ШЭРШАНЬ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК

Ж 359/60

Пчала і шэршань

Прышла вясна. Выраслі ў лесе пахучыя красачкі. Зацьвіла чаромха ў гаі. Цёпла, весела. Зазьвінелі камарыкі, мушкі. Замільгалі ў паветры матылькі.

29-38172

ПУБЛ. БІБЛ. имени В. И. ЛЕНИНА С. С. С. Р.

Вылецела пчолка з вульля. Паляцела яна мядок зьбіраць. Зьбірае яна мядок, аж чуе—шэршань гудзе. Падлятае шэршань да пчолкі.

— Пчолка! будзь маёю жонкай.

— Пачакай, шэршню. Давай наўперад мёду прыстараемся, а на восень пажэнімся.



І паляцела пчолка на красачкі, мядок зьбірае.
Цэлае лета працуе яна, мядку прыпасае.
А шэршань цэлую ноч у гнілой асіне сядзіць.
Дзень настане—выпаўзе з асіны, пагрэецца на сонцы, а потым у гай ляціць, сам нічога ня робіць, пагульвае. І так прагуляў ён цэлае лета.

Прышла восень. Халадна стала. Павялі красачкі. А пчолка мёду нанасіла і сама ляціць да шэршня.

Сядзіць шэршань на асіне каля дзірачкі.

Халадна там. Адубеў шэршань, ляцець ня можа.

— Ну, што, шэршань, будзем жаніцца?— пытае пчолка. А шэршань толькі лапкамі паварушыў і піснуў:

— Ня лезь, ня лезь, бо ўдавою застанешся.

КАНЕЦ

705

ЦАНА 20 КАП.

КАНЕЦ